

ШКОЛЫ — ПАД АХОВАЙ МУС

5

ТЭСТ НА «КАЛЬМАРА»

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. СУБОТА № 210 (29579)

## КОРАТКА

- МНС запускае новую інфармацыйную кампанію «Бяспечная старасць».
- **Беларусь забяспечана запасамі торфу на найбліжэйшыя 100 гадоў.**
- Дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту Беларусі ў студзені — верасні склаў Br1,1 млрд.
- **У Беларусі ўведзена часовая забарона на вываз кіслароду.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Прэзідэнт даручыў дэпутацкаму корпусу ўзяць пад кантроль дамы-інтэрнаты і аддзяленні круглasутачнага знаходжання і аказаць ім дапамогу ў супрацьстаянні эпідэміі. Дэпутаты разам з выканаўчай уладай, валанцёрскім рухам, грамадзянскай супольнасцю вельмі сур'ёзна займаюцца гэтымі пытаннямі. Кожны дом-інтэрнат на кантролі, падтрымліваецца сувязь з мясцовымі органамі ўлады. Дзякуючы такой зладжанай рабоце, узаемадзеянню з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, Міністэрствам аховы здароўя нам удалося не дапусціць сур'ёзных успышак. Дастаткова сказаць, што з 21 тысячы чалавек, якія пражываюць і якія працуюць тут, на сёння толькі 33 чалавекі захварэлі на ковід. Персанал сацыяльных устаноў гатовы да працы падчас пандэміі, ёсць неабходныя сродкі аховы і лекі».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы ўмеем рабіць усё, калі мы суверэнныя, незалежныя»



Фота БелТА.

**Экспарт прадукцыі дрэваперапрацоўкі з высокай дабаўленай вартасцю, развіццё новых вытворчасцяў і мэтавыя падыходы да прадпрыемстваў дрэваперапрацоўчай галіны, якія адстаюць у тэмпах росту. Пра гэта і не толькі ішла гаворка падчас рабочай паездкі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Добруш. Кіраўнік дзяржавы наведваў філіял «Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы» ААТ «Кіруючая кампанія «Беларускія шпалеры».**

Стратэгічна важны інвестыцыйны праект па выпрабе мелаваных і немелаваных відаў кардону, які рэалізоўваецца на гэтым прадпрыемстве, — на асаблівым кантролі Прэзідэнта. Сёлета 1 чэрвеня быў падпісаны акт уводу ў эксплуатацыю новай вытворчасці. На першапачатковым этапе ў Добрушы асвоілі выпуск немелаванага кардону, у другой палове ліпеня атрымалі і мелаваны кардон...

Візіт кіраўніка дзяржавы на прадпрыемства — імкненне ацаніць, якія абароты набірае новая вытворчасць. Асноўнае пытанне: што асваенне вытворчасці мелаваных відаў кардону дасць эканоміцы краіны, што новая вытворчасць прынясе раёну і рэгіёну ў цэлым і ці дапаможа замацаваць людзей у райцэнтры.

СТАР. 2

# Першыя вокны квартала № 2



Будоўля ў горадзе-спадарожніку — Смалявічах. Цяпер узводзіцца другая чарга жылых шматпавярховых дамоў, а ўсяго іх будзе чатыры. Новабудоўлямі займаецца вядомая ў краіне мінская домабудаўнічая арганізацыя ААТ «Мапід».



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Розныя — роўныя

# БАЧЫЦЬ І РАЗУМЕЦЬ ІНШАГА — ВЕЛЬМІ ВАЖНА

**Абмежаваныя магчымасці — не прычына не даследаваць свет, тым больш калі ён такі бязмежны. Інклюзіўны турызм сёння — бадай ці не самы папулярны кірунак у турыстычнай галіне. Беларусь таксама не адстае. Гэта даказаў выязны семінар Нацыянальнага агенцтва па турызме, у межах якога аграсядзібы паказалі, наколькі яны гатовыя прымаць асаблівых гасцей. Семінар прайшоў у межах тыдня адчыненых дзвярэй у беларускіх аграсядзібах.**

Сёлета Сусветная турысцкая арганізацыя (ЮНВТА) абрала тэмай Сусветнага дня турызму «Турызм для інклюзіўнага росту». Як спецыялізаваная ўстанова ААН, турысцкая арганізацыя прыкладае намаганні для забеспячэння інклюзіўнага аднаўлення і росту. Турызм мае важнае значэнне для ўсіх мэтаў у галіне ўстойлівага развіцця. Асабліва гэта датычыцца такіх накірункаў як барацьба з беднасцю, гендарная няроўнасць, годная работа, эканамічны рост і скарачэнне няроўнасці.

У Беларусі стварэнне інклюзіўнага асяроддзя на турыстычных аб'ектах прадугледжана Нацыянальнай стратэгіяй развіцця турызму да 2035 года. Мерапрыемствы таксама запланаваныя і праграмай «Беларусь гасцінная». Даступнае асяроддзе павышае турыстычную прыцягальнасць краіны для сваіх грамадзян і замежных гасцей.

СТАР. 12

# «Мы ўмеем рабіць усё, калі мы суверэнныя, незалежныя»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Добрушская папяровая фабрыка — адзін з філіялаў холдынга «Беларускія шпалеры». Генеральны дырэктар холдынга Аляксандр Каляда расказаў кіраўніку дзяржавы аб выніках інвестыцыйнага праекта па тэхнічным перааснашчэнні фабрыкі і арганізацыі тут вытворчасці мелаваных і немелаваных відаў кардону. Па словах гендырэктара, увод у эксплуатацыю вытворчасці мелаванага і немелаванага кардону дазволіў нават на пачатковым этапе дасягнуць станоўчых фінансавых паказчыкаў фабрыкі. За студзень-верасень аб'ём вытворчасці прадукцыі (у фактычных цэнах) вырас да аналагічнага перыяду мінулага года ўдвая.

Новая добрушская вытворчасць дасць магчымасць скарацiць імпарт гэтай прадукцыі і забяспечыць у поўнай меры патрэбы ва ўпакоўцы харчовай, лёгкай, медыцынскай і паліграфічнай прамысловасці Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць выкарыстання ўсяго драўніннага рэсурсу краіны. Цяпер асобныя віды драўніны не ўцягнуты або недастаткова ўцягнуты ў перапрацоўку, звярнуў увагу Прэзідэнт. У сувязі з гэтым сёння абмяркоўваецца стварэнне вытворчасці беленай хіміка-тэрмамеханічнай масы на пляцоўцы «Магілёўхімвалакно». Гэта фактычна паўфабрыкат для вытворчасці кардону ў Добрушы. Па словах намесніка прэм'ер-міністра Юрыя Назарава, такое прадпрыемства можа каштаваць 200—250 мільёнаў долараў. Вядуцца перагаворы з інвестарам. Прэзідэнт даручыў прапрацаваць пытанне, ці можна стварыць гэтае прадпрыемства за кошт дзяржаўных сродкаў.

Старшыня «Беллеспаперапрама» Міхаіл Касько далажыў кіраўніку дзяржавы аб рабоце канцэрна і выніках мадэрнізацыі цэлюлозна-папяровай галіны. Ён падкрэсліў, што, нягледзячы на цяжкасці, звязаныя з пандэміяй каранавіруса, арганізацыі «Беллеспаперапрама» працуюць устойліва. Прадпрыемствы выконваюць усе планавыя параметры сацыяльна-эканамічнага развіцця, чакаецца выкананне ўсіх даведзеных канцэрну паказчыкаў па выніках работы года.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як ідуць справы ў праблемных прадпрыемстваў канцэрна. У прыватнасці, ён заявіў аб намеры наведаць дрэваапрацоўчы завод «ФанДАК» у Бабруйску. Падрабязна кіраўніку дзяржавы таксама далажылі аб стане спраў на «Віцебскдрэве» і «Барысаўдрэве».

Вяртаючыся да запуску новай вытворчасці мелаваных і немелаваных відаў кардону, кіраўнік дзяржавы пацікавіўся і сацыяльнай роляй прадпрыемства ў жыцці райцэнтра. Вытворчасць дасць магчымасць працаўладкаваць 530 чалавек, сёння на прадпрыемстве застаецца 20 вакантных месцаў, працягваецца грунтоўны адбор кадраў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што новая вытворчасць у Добрушы адкрывае новыя перспектывы не толькі для самога горада, але і для краіны ў цэлым, бо сваё развіццё атрымаюць і прадпрыемствы ў іншых рэгіёнах. Прэзідэнт падкрэсліў, што з выхадам на праектную магутнасць прадпрыемства будзе паказваць добрыя вынікі, а гэта адпаведна адаб'ецца на зарплатах супрацоўнікаў.

— Усё ў вашых руках. Вы разумееце, што з неба грошы не падаюць, іх трэба зарабляць, — падсумаваў ён. Прэзідэнт таксама заўважыў, што дзяржава вельмі шмат зрабіла для стварэння новай вытворчасці на Добрушскай папяровай фабрыцы і гэта каштавала немалых грошай. Аляксандр Лукашэнка заклікаў работнікаў прадпрыемства цаніць тое, што зроблена.

## «Неабходна працаваць і зарабляць»

**Прэзідэнт выступіў перад калектывам Добрушскай папяровай фабрыкі і адказаў на пытанні супрацоўнікаў.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што заснаванне новай вытворчасці стала навукай для айчынных вытворцаў і будаўнікоў.

«Гэта перспектыва. Гэта развіццё не толькі для Добруша, але і ўвогуле для Гомельскай вобласці. Будзем далей думаць, як паглыбляцца», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён акцэнтаваў увагу на магчымасцях, пра якія паведаміў дырэктар фабрыкі. Пры наяўнасці 2-3 мільёнаў долараў маглі б закупіць некалькі сучасных машын для наразання ліставога кардону, запыт на які добры на сусветным рынку.

«Мы дамовіліся, што ў найбліжэйшы час вы самі закупіце, мы вам дапаможам з машынамі. Будзеце паглыбляцца, выпускаць больш разнастайную прадукцыю на гэтым прадпрыемстве», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заявіў, што добра ведае праблемы малых гарадоў. Таму, каб людзі там жылі і развівалі тэрыторыі, неабходна добрая работа.

«Вы зараз не мільянеры, канешне, але адчулі, што тут можна зарабляць. Я ўпэўнены, што з выхадам на праектныя магутнасці ў вас увогуле не будзе пытанняў па заработнай плаце», — заявіў Прэзідэнт.

Ён папрасіў супрацоўнікаў ацаніць, наколькі шмат дзяржава зрабіла для пераадолення праблем на Добрушскай фабрыцы. «Мы з вамі выраслі ў такіх гарадах, пасёлках. Мы з вамі ведаем кошт працы, мы ведаем, што ніадкуль нічога не бярэцца. Неабходна працаваць і зарабляць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заявіў, што беларускія прадпрыемствы (у тым ліку і ў машынабудаўніцтве) — канкурэнты для іншых еўрапейскіх кампаній: «Мы на рынку прадаём тое, што яны хацелі б прадаваць. Яны вырабіць могуць столькі, колькі захочуць. Але неабходна прадаць, а рынкі занятыя намі. «БелАЗы» 30 працэнтаў сусветнага рынку займаюць. Вы чаму думаеце яны санкцыі ўводзяць супраць «БелАЗа»?» Прэзідэнт адзначае, што пасля праблем з падрадчыкам будаваць фабрыку вырашылі самі. Кіраўніцтва вытворчасці вельмі хвалявалася за энергетычнае забеспячэнне фабрыкі.

«Я сказаў — пабудуем. Нашы энергетыкі ўмеюць гэта рабіць. Зрабілі. ***Мы ўмеем рабіць усё, калі мы суверэнныя, незалежныя, калі мы разумеем, што робім для сябе і свайго народа***», — дадае Аляксандр Лукашэнка.

## «Дрэвапераапрацоўцы быць»

«Ці хапае ў краіне драўніны для паўнавартаснай работы ствараных у краіне перапрацоўчых прадпрыемстваў?» — пытаецца ў Прэзідэнта адна з супрацоўніц добрушскай фабрыкі.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, тры мільёны кубаметраў драўніны перастаяла, бо завод у тым жа Добрушы здольны перапрацоўваць толькі 500 тысяч тон. «Нам трэба яшчэ шэсць такіх прадпрыемстваў, каб «перапалацiць» тое, што перастаяла. А да гэтага часу падыдзе яшчэ бяроза і асіна. Ліставыя хутка растуць. То-бок, уся праблема не ў тым, што не хопіць. Нам неабходна стварыць дадатковыя магутнасці, каб выхапіць з лесу тое, што будзе прападаць», — растлумачыў сітуацыю Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што падобная праблема з драўнінай разглядалася некалькі гадоў таму. Тады кіраўнік краіны даў даручэнне для перапрацоўкі пабудаваць сем пелетных заводаў за год. Заданне перавыканалі: пабудавалі дзесяць.

«Забіраюць усё з калёс, і цэны прыстойныя на гэтае «смецце», якое мы ператварылі ў чыстае паліва. Хутка і мы пяройдзем на яго. Гэтым неабходна абаграваць дачы, дамы і нават вам у горадзе цяпло падаваць, спальваючы на цэнтралізаваных кацельнях менавіта гэта, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба на экалагічна чыстае паліва пераходзіць. Мы змаглі за паўтара года амаль усё смецце, буралом, які гніў і вы не паспявалі перарабляць, пусціць у пелеты. Прадалі і атрымалі добры прыбытак».

«Дрэвапераапрацоўцы быць. Мы, мадэрнізуючы апрацоўвальныя прадпрыемствы, многаму навучыліся. І калі я задаю пытанне: мы зможам такое прадпрыемства самі пабудаваць? Няма пытанняў. Нам ніхто не патрэбны. Нам патрэбны грошы», — канстатаваў Прэзідэнт.

## Пра аб'яднанне ЦТ і выпускных экзаменаў

Пытанне ад шматдзетнай маці з Добруша: ці будуць усё-такі аб'яднаны выпускныя школьныя экзамены і цэнтралізаванае тэсціраванне? Прэзідэнт адказаў, што канчатковае рашэнне прымуць у найбліжэйшы час. Зараз праект адпаведнага ўказа кіраўніка краіны дапрацоўвае Міністэрства адукацыі, Адміністрацыя Прэзідэнта, урад.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, з 2023 года два экзамены (школьны і ЦТ) аб'яднаюць. То-бок два прадметы будуць здаваць не ў школе, а адразу на пляцоўках ЦТ. Адзнака за іх пойдзе ў атэстат.

«Мы крыху хочам зняць нагрузку з дзяцей, таму аб'ядноўваем два экзамены агульнашкольныя, выведзем іх на пляцоўку ЦТ. Здаўшы ЦТ, атрымаеш сертыфікат з адзнакай, якая пойдзе і ў атэстат. Потым неабходна будзе здаць адзін профільны экзамен для паступлення», — тлумачыць будучае наваўвядзенне Прэзідэнт.

## Пытанне абмяркоўваецца

Малады галоўны інжынер Добрушскай фабрыкі пытаецца пра адмену льгот па падатак за нерухомасць для ўладальнікаў кватэр. Прэзідэнт паведамляе: такое пытанне разглядаецца ва ўрадзе і зыходзіць з неабходнасці спрашчэння падатковага заканадаўства.

«Увесь час бізнес скардзіўся, што падатковае заканадаўства вельмі складанае, што неабходна быць з дзвюма вышэйшымі адукацыямі, каб разабрацца ў тэхналогіі. Я даручыў ураду, каб вярнуліся да гэтых пытанняў і зрабілі простае падатковае заканадаўства. Яно зусім простым не будзе. Трэба быць эканамістам і бухгалтарам, каб гэта ўсё вылічваць. Але там, дзе магчыма спрасціць, неабходна спрасціць», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

У гэтай сувязі, паводле Прэзідэнта, абмяркоўвалася пытанне падаткаў на сяле і ў горадзе. «На сяле ў нас пляцоўка і за зямлю падатак, і за нерухомасць, а горад нейк застаўся ўбаку. Абмяркоўваецца гэта пытанне. Не ведаю, якія там стаўкі, але гэта будзе мізер — 1,5-2 рублі», — паведаміў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адзначае, што мэты павялічыць падаткі няма, бо яны і так дастаткова высокія з-за адсутнасці ў краіне вуглевадародных радовішчаў. Але падаткі, якія плануецца ўвесці, рэзюмуе Прэзідэнт, будуць невялікія, калі рашэнне па іх прымуць увогуле.

Міхаіл Касько, старшыня канцэрна «Беллеспаперпрам» (сёлета ведамства адзначыла 30-годдзе) у канцы сустрэчы ўручыў Прэзідэнту нагрудны знак «За асабісты ўнёсак у развіццё галіны» і кнігу пра мадэрнізацыю вытворчасцяў.

Холдынг «Беларускія шпалеры» прэзентаваў па памяць кіраўніку краіны карціну з выявай гістарычнай часткі памяшканняў Добрушскай папяровай фабрыкі.

«Гэта сапраўды ўнікальна. Вельмі важна, што вы гэта захавалі для нашых спецыялістаў, праекціроўшчыкаў, каб, ствараючы пабудовы, яны рабілі так. Дзякуй вялікі за падарункі. Але гэта не значыць, што вы са мной разлічыліся... Вы мне павінны толькі адно — захавайце прадпрыемства, працуйце і жывіце па-сяброўску», — завяршыў Прэзідэнт.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, Марыя ДАДАЛКА.**

Прэзідэнт патлумачыў супрацоўнікам Добрушскай папяровай фабрыкі, чаму звяртае такую ўвагу на ўборку кукурузы, якая застаецца на палях. Па яго словах, свет пачаў галадаць і цэны на харчаванне выраслі.

«З аднаго боку — добра. На гэтым сёлета заробім 6,5 мільярда долараў, прадаючы харчаванне, бо запыт каласальны. У Расію, Кітай, у 75 краін свету пастаўляем сваё харчаванне. Гэта найлепшае харчаванне ў свеце. І яно тут, на зямлі. Таму з губернатараў, старшынь райвыканкамаў трэба выцiснуць усё, каб закончыць гэты год, атрымаць корм і прадаць больш прадукцыі. Але і свой народ неабходна накарміць. Тут у нас праблем няма», — паведамляе Прэзідэнт.

Беларусь — адна з нямногіх краін, якая не спынiла з-за каранавіруса прамысловасць і ёй удалося зарабіць на экспарце. «У мінулым годзе спрацавалі ндрэнна. А ў гэтым годзе яшчэ дададзім па ўсіх кірунках, але для сельскай гаспадаркі быў год не вельмі добры. Ну і санкцыямі нас спрабуюць тут прыціснуць. Мала добрага, але трымаемся. Гэта вы павінны разумець: калі толькі апусцімся на калені, ніколі не ўстанем», — сцвярджае кіраўнік краіны.

---

Улада на сувязі

## Нязначных пытанняў не бывае

**У аўторак, 2 лістапада, віцэ-спікер Савета Рэспублікі Анатоль Міхайлавіч Ісачанка правядзе прамую тэлефонную лінію.**

Званкі будуць прымацца з 10.00 да 13.00 па тэлефоне ў Мінску 8 (017) 328-53-24.

## Вырасце бюджэт пражытачнага мінімуму

### А разам з ім — некаторыя дапамогі на дзяцей і пенсіі

**З 1 лістапада ў Беларусі павысяць бюджэт пражытачнага мінімуму. З наступнага месяца ён у сярэднім на душу насельніцтва складзе 288,01 рубля. Раней БПМ быў 283,46 рубля. Разам з гэтым вырастуць памеры некаторых дапамог, якія прадугледжаны пры нараджэнні дзяцей, а таксама сацыяльныя пенсіі.**

Змяненні прадугледжаны пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны № 71 на перыяд з 1 лістапада 2021 года да 31 студзеня 2022 года.

Як паведамляе прэс-служба ведамства, бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ўстаноўлены ў памеры 288 рублёў 1 капейкі, што на 1,6 % вышэй у параўнанні з нарматывамі, якія дзейнічаў з 1 жніўня да 31 кастрычніка 2021 года.

Гэта чацвёрты перараздік у 2021 годзе (1 лютага, 1 мая, 1 жніўня і 1 лістапада). Такім чынам, памер бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў параўнанні з яго значэннем, якое дзейнічала з 1 лістапада 2020 года, вырас на 11,6 %.

У сувязі са змяненнем БПМ з 1 лістапада аўтаматычна пераглядаюцца ўбудаваныя ў сістэму сацыяльнай абароны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічваюцца ад памеру БПМ. Гэта памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, сацыяльныя пенсіі, павышэнні да пенсій, якія прадугледжаны для асобных катэгорый пенсіянераў, даплаты і надбаўкі пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

Гэтыя выплаты павялічыліся суразмерна росту БПМ на 1,6 %. У прыватнасці, аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці з 1 лістапада вырасце да 2 880,1 рубля (цяпер яна 2834,6 рубля). Сацыяльная пенсія па ўзросце павялічыцца да 144,01 рубля (цяпер 141,73 рубля). Мінімальную пенсію па ўзросце павысяць да 72 рублёў (гэта сума без 20 % даплаты ад сярэдняй зарплаты). Даплата непрацоўным пенсіянерам, якія дасягнулі 75 гадоў, павысіцца да 54 рублёў, а тым, хто дасягнуў 80 гадоў, — да 72.

**Алена КРАВЕЦ.**

Акцэнты

Наталля КАЧАНАВА:

# «БДУ крочыць разам з краінай, а дзесьці і наперадзе»

## Ад імя Прэзідэнта Старшыня Савета Рэспублікі павіншавала БДУ са стагоддзем

**Напярэдадні юбілейнай даты, 29 кастрычніка, адбылося ўрачыстае пасяджэнне Савета ўніверсітэта, у якім прынялі ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга Чупрыс.**



Фота БелТА.

Спікер верхняй палаты парламента зачытала віншаванне ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у якім адзначалася, што стагадовая гісторыя вядучага ВНУ краіны напоўнена шматлікімі цікавымі падзеямі і вялікімі дасягненнямі.

— Развіваючыся разам з краінай, БДУ фарміраваў нацыянальную інтэлігенцыю, умацоўваў самасвядомасць народа і беларускую дзяржаўнасць. За гэтыя гады ВНУ падрыхтаваў тысячы спецыялістаў, створаны вядучыя навуковыя школы, распрацаваны новыя ўнікальныя метады, тэхналогіі і практыка, якія дазволілі Беларусі дасягнуць эканамічнага суверэнітэту і стаць прызнаным лідарам у развіцці чалавечага патэнцыялу, — гаворыцца ў віншаванні.

У ім адзначаецца, што, дзякуючы штодзённай напружанай працы некалькіх пакаленняў, БДУ увайшоў у склад найлепшых ВНУ свету, стаў найбуйнейшым навукова-вытворчым цэнтрам. У аснове гэтага поспеху — вернасць традыцыям, дух стварэння і імкненне да новага.

Таксама кіраўнік краіны ў сваім звароце выказаў упэўненасць, што калектыў і надалей будзе прыкладаць усе намаганні для навучання і выхавання сапраўдных патрыётаў, адданых Радзіме, а ўклад універсітэта ў развіццё інтэлектуальных, эканамічных і вытворчых рэсурсаў Беларусі будзе толькі памнажацца.

Са свайго боку Наталля Качанава, звяртаючыся да супрацоўнікаў, педагогаў, студэнтаў і выпускнікоў БДУ, адзначыла, што не кожнаму дадзена магчымасць адзначаць такі юбілей:

— Мы сёння спрычыніліся да гістарычнай падзеі ў жыцці не толькі ўніверсітэта, але і нашай краіны. Таму што сёння Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — гэта не проста найбуйнейшы навуковы адукацыйны цэнтр краіны, а ўстанова, прызнаная не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі, — перакананa спікер верхняй палаты парламента. — Гэта сур'ёзныя перадавыя навуковыя цэнтры, і выстаўка, якая прадстаўлена тут, пацвярджае гэта — вы крочыце разам з нашай краінай.

Развіваючы думку далей, спікер верхняй палаты падкрэсліла, што дынаміка гэтага руху звядзіцца не толькі да навукі і адукацыі, але і дапамогі ў рэалізацыі праблем і задач, што стаяць перад дзяржавай.

— Сёння эксперты і навукоўцы працуюць разам з намі па распрацоўцы заканадаўства краіны, разам займаемся Асноўным Законам — Канстытуцыяй, — патлумачыла Наталля Качанава. — Я ўбачыла распрацоўкі па лячэнні і прадухіленні ковід-інфекцыі. Гэта тыя выклікі, якія ставіць перад намі жыццё. І вы крочыце разам, а дзесьці і наперадзе.

Гаворачы пра гісторыю БДУ, Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на пераемнасці традыцый і пакаленняў:

— Працяг славутых традыцый, закладзеных яго заснавальнікамі, дазволіў атрымаць прызнанне ва ўсім свеце, — падкрэсліла яна і падзякавала калектыву ВНУ. — Дзякую за працу па падрыхтоўцы спецыялістаў для ўсіх галін краіны, не патрыётаў.

Наталля Качанава адзначыла, што ў Беларусі сёння няма віводнага прадпрыемства, арганізацыі ці ўстаноў, дзе б ні працавалі выпускнікі БДУ. За сто гадоў свайго існавання вядучае ВНУ краіны падрыхтавала 185 тысяч спецыялістаў для розных сфер дзейнасці краіны.

### Віцэ-прэм'ер — выкладчыкам: «Не эканомце веды»

Са словамі віншавання звярнуўся і **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

— Сёння знакавая падзея для ўсіх нас — вы перасягнулі 100-гадовы юбілей. І наступныя 100 гадоў новымі поспехамі і дасягненнямі мы такама павінны развіваць наш універсітэт, — перакананы ён і паведаміў, што ўрад пільна сочыць за ВНУ, дапамагае яму развівацца ва ўдасканаленні матэрыяльна-тэхнічнай базы, падтрымцы студэнтаў, развіцці і перападрыхтоўцы выкладчыцкіх кадраў.

Віцэ-прэм'ер пажадаў цяперашнім студэнтам атрымліваць задавальненне ад занятку:

— Каб яны ўбіралі тую магутную энергетыку ведаў, шырыню душы выкладчыкаў, імкнуліся стаць добрымі спецыялістамі і цэласнымі асобамі, — выказаў спадзяванне віцэ-прэм'ер і пажадаў ім не эканоміць свае веды, энергетыку, а рэалізоўваць у студэнтах тое, што, на іх погляд, не ўдалося рэалізаваць ім самім. — Менавіта вашы дасягненні, якія потым трансфармуюцца ў вашых студэнтах, — самыя добрыя справы і самая вялікая падзяка, якая толькі можа быць у сапраўднага выкладчыка.

Ён падкрэсліў, што тут працуюць людзі, якія скончылі ВНУ і па загадзе душы і сэрца сталі выкладаць, выхоўваюць студэнтаў, каб тыя сталі не толькі добрымі і таленавітымі спецыялістамі, але і ўсебакова развітымі асобамі. А ўсё гэта ёсць у БДУ.

### У аснове — любоў да Радзімы

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС ад імя кіраўніка Адміністрацыі Ігара СЕРГЕЕНКІ** і сябе асабіста, як абодвух выпускнікоў гэтага ўніверсітэта, павіншавала ўсіх з выдатным святам.

— Ва ўніверсітэце ёсць дзве вялікія каштоўнасці — выкладчыкі і выпускнікі. Разам яны фарміруюць імідж універсітэта, — лічыць яна і падкрэслівае, што яднальным стрыжнем, асновай існавання двух гэтых элементаў і іх узаемадзеяння з'яўляюцца духоўна-маральныя каштоўнасці, сфарміраваныя ў беларускай дзяржаве і грамадстве. — Гэта любоў да Радзімы і, адпаведна, да сваёй альма-матар. Гэта павага да старэйшых пакаленняў і да нашых настаўнікаў, якія далі пуцёўку ў жыццё. Гэта ўслаўленне дасягненняў краіны, БДУ і іх прымнажэнне ўласнымі намаганнямі. Гэта, вядома, карпаратыўнасць, якую я нават бы назвала сямейнасцю ў добрым сэнсе гэтага слова, як фарміраванне і развіццё дынастый. Бо, калі ва ўніверсітэт прыходзяць вучыцца дзеці былога студэнта, а потым — унукі, праўнукі, адпаведна, універсітэт жыве і развіваецца. Калі ўслед за бацькам ва ўніверсітэт прыходзяць працаваць яго дзеці, карпарацыя мацнее.

Вольга Чупрыс расказала, што ёй пашчасціла быць ва ўсіх ролях:

— Услед за сваімі продкамі вучылася ва ўніверсітэце, тут вучыўся мой сын. Я працавала ва ўніверсітэце, мой сын падзарабляе тут па прызванні.

Яна прызналася, што хацела б, каб ва ўніверсітэт прыйшлі яе ўнукі і праўнукі, і пажадала роднаму ўніверсітэту не адно стагоддзе развіцця і росквіту на карысць Рэспублікі Беларусь.

### Ушанаванне заслуг

У рамках афіцыйнай часткі Савета БДУ ганаровыя госці ўшанавалі прадстаўнікоў ВНУ дзяржаўнымі і ведамаснымі ўзнагародамі. У ліку ўзнагароджаных — супрацоўнікі, навукоўцы, дэканы факультэтаў і дырэктары інстытутаў, загадчыкі кафедраў, прафесары і супрацоўнікі розных структур ВНУ. Ордэны, медалі і ганаровыя званні атрымалі прадстаўнікі ВНУ за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўнёсак у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, укараненне вынікаў навуковых даследаванняў у вытворчасць, развіццё беларускай культуры і выхаванне творчай моладзі, дасягненні ў сферы навукі, аховы здароўя і медыцыны.

Трэба дадаць, што за сто гадоў свайго існавання ў БДУ было падрыхтавана 4700 кандыдатаў навук, больш за 15 тысяч замежных спецыялістаў, магістрантаў, аспірантаў. У ліку выпускнікоў — вядомыя навукоўцы, акадэмікі, прафесары, лаўрэаты дзяржаўных прэмій СССР, БССР і Беларусі, менеджары вышэйшага звяна буйных кампаній. Са сцен БДУ выйшлі народныя паэты, заслужаныя дзеячы, прызёры Алімпійскіх гульняў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

• **Даслоўна**

Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ:

## «Эканамічная інтэграцыя — на карысць упэўненасці ў заўтрашнім дні»

**Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі расказаў аб тым, чаго чакаць ад пасяджэння дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы.**

— Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, Старшыня Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, вызначыў асаблівую дату — 4 лістапада, калі падчас пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін і нацыянальны лідар Беларусі прапануюць тыя рашэнні, якія на доўгія гады вызначаць іншы ўзровень эканамічнай інтэграцыі пры захаванні незалежнасці і суверэнітэту як Беларусі, так і Расіі, — расказаў ён падчас візэзавароту з нагоды 100-гадовага юбілею БДУ.

Дзяржсакратар падкрэсліў, што ўсе рашэнні бакамі прымаюцца ў інтарэсах і на карысць людзей:

— На карысць нашай упэўненасці ў дні цяперашнім і дні заўтрашнім, на карысць канкурэнтаздольнасці нацыянальных эканомік і дзеля таго, каб ніхто не спрабаваў панукаць беларусамі і расіянамі, — акцэнтуе Дзмітрый Мезенцаў. — Паказваць, як нам жыць, вучыць нас, што трэба рабіць, і тым больш не дазваляць, каб мы паддаліся на ціск шэрагу заходніх сталіц аб тым, хто для дзіцяці лепшы: маці ці бацька? Ці, можа, бацька нумар адзін ці нумар два?!

Ён падкрэсліў: важна памятаць аб тых патрабаваннях, якія сёння фарміруюцца ў Еўропе:

— Мы гэта ведаем, самі памятаем сваю адзіную гісторыю, тых герояў, якія стваралі асаблівыя, гераічныя, яскравыя старонкі для Беларусі і Расіі. І сярод гэтых герояў — прафесары і выкладчыкі, выпускнікі вядомага, яркага і вельмі прафесійнага Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Інфляцыя ў еўразоне дасягнула 13-гадовага максімуму

Яна склала 4,1 працэнта, што стала найвышэйшым паказчыкам з часоў сусветнага эканамічнага крызісу 2008 года. Гэта звесткі Еўрастата. Цяперашнія паказчыкі інфляцыі ў еўразоне амаль удвая перавышаюць гадавы прагноз Еўрапейскага цэнтральнага банка (ЕЦБ) у 2,2 %. Для параўнання: у студзені інфляцыя ў краінах рэгіёна складала ўсяго 0,9 %, у маі яна дасягнула 2 %, а пасля падскочыла да 3 % у жніўні. Але ў кастрычніку яе паказчыкі яшчэ больш узраслі з-за энергетычнага крызісу, які справакаваў рэзкі рост цэн не толькі на электраэнергію, але і на многія віды тавараў і паслуг. У кастрычніку інфляцыя на энерганосьбіты дасягнула ашаламляльных 23,5 % . Еўрапейская камісія чакае, што выдаткі на электраэнергію застануцца высокімі да сакавіка ці красавіка 2022 года, пакуль не скончыцца ацяпляльны сезон. Адзінымі краінамі еўразоны, дзе інфляцыя аказалася ніжэйшая за парог 2 %, сталі Мальта (1,4 %) і Партугалія (1,8 %).

### Каля 6 млн жыхароў Кітая апынуліся ў зоне лакдаўну з-за ўспышкі COVID

Прыкладна 6 млн жыхароў КНР, уключаючы 4 млн у горадзе Ланьчжоу (правінцыя Ганьсу), трапілі ў рэжым ізаляцыі ў сувязі з новай успышкай COVID-19. Паводле даных СМІ, за папярэднія суткі ў краіне выявілі 48 выпадкаў захворвання, а за мінулы тыдзень — каля 250. Улады прадпрымаюць меры па стрымліванні распаўсюджвання захворвання: так, дзясяткі тысяч жыхароў Пекіна былі змешчаныя на каранцін. Насельніцтва заклікалі адмяніць масавыя мерапрыемствы. Таксама адмянілі палову авіярэйсаў у двух асноўных аэрапортах Пекіна — «Шоўду» і «Дасін». Адміністрацыя Харбіна — сталіцы памежнай з Расіяй правінцыі Хэйлунцзян — перасцерагла каля 10 мільёнаў гараджан ад паездак за мяжу і прыпыніла трафіку рэйсаў у гарадскім аэрапорце.

### Facebook змяніў назву на Meta




Пра рэбрэндынг было абвешчана на штогадовай канферэнцыі дэвелапераў Facebook. Паводле афіцыйнай версіі, новая назва будзе лепш адпавядаць цяперашняй дзейнасці кампаніі. Як паведамляе Associated Press, перайменаванне, па задуме аўтараў, стане адным з крокаў па развіцці новага «метасусвету» (metaverse) — анлайн-асяроддзя, дзе карыстальнікі змогуць працаваць, мець зносіны, гуляць у гульні, у тым ліку з дапамогай гарнітуры віртуальнай рэальнасці. Па словах кіраўніка Facebook Марка Цукерберга, ён разлічвае, што ў найбліжэйшыя дзесяць гадоў у метасусвеце будзе ўжо мільярд удзельнікаў.

# Абазнач сябе — захавай жыццё

## Разам з супрацоўнікамі ДАІ карэспандэнт «Звязды» высвятляла, ці носяць людзі флікеры

**З наступленнем восені ў супрацоўнікаў Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі работы дадаецца ў разы. З пачаткам вучэбнага года павялічваецца колькасць удзельнікаў дарожнага руху, ускладняюць абстаноўку на дарогах праліўныя дажджы і першыя замаразкі, накладае свой сумны адбітак і нашмат карацейшы светлавы дзень...**

**Невыпадкова большасць аварый здараецца менавіта ўвечары або ноччу. Павялічваецца колькасць дарожна-транспартных здарэнняў і з удзелам пешаходаў. І калі б яны падчас руху (прычым абсалютна не мае значэння — ідуць людзі ўздоўж магістраляў або вясковых дарог) абазначалі сябе святлоадбівальнымі элементамі, колькі трагедый можна было б пазбегнуць!**

**У тым, што грамадзяне грэбуюць флікерамі, а адпаведна, падвяргаюць сваё жыццё небяспецы, карэспандэнт «Звязды» яшчэ раз упэўнілася, калі на днях напрасілася да супрацоўнікаў Дзяржаўнай аўтаінспекцыі на дзяжурства.**



> «Строгіх правілаў, як насіць флікеры, няма: галоўнае, каб чалавека было відаць і спераду, і ззаду. Лепш за ўсё, калі пешаход будзе апрануты ў адзенне з ушытымі святлоадбівальнымі элементамі. Калі гэта нарукаўная павязка, дастаткова яе павесіць на перадплечча, і чалавек будзе прагледжвацца з абодвух бакоў. Флікер на сумцы — не выхад: ён лёгка закрываецца, таму не заўсёды эфектыўны».

> «Некаторыя грамадзяне яшчэ не перастроіліся, што надышоў перыяд, калі трэба раней, чым звычайна, насіць святлоадбівальныя элементы. Невыпадкова, калі на працягу года мы першы раз спыняем чалавека, які ідзе ўздоўж дарогі без флікера, адміністрацыйны пратакол не складаецца. Мы выносім грамадзяніну папярэджанне, якое фіксуецца ў нашай базе, каб наступны раз, калі пешаход парушыць правілы дарожнага руху, мы добра ведалі: быў ён дагэтуль папярэджаны ці не. Калі ж неабазначаны пешаход трапляе ў поле нашага зроку паўторна на працягу года, яму ўжо выносіцца штраф у памеры ад адной да трох базавых велічынь».

### НА ПЕРШЫ РАЗ — ПАПЯРЭДЖАННЕ

З экіпажам ДАІ Мінскай вобласці мы выехалі ў рэйд акурат у пятніцу: вечар напярэдадні суботы ды і самі выхадныя традыцыйна лідзіруюць па колькасці аварый. У гэтыя дні ў міліцыянераў найбольш напружаныя змены.

Наш маршрут пралягае па населеных пунктах, якія знаходзяцца за некалькі кіламетраў ад сталіцы. Гэта акурат той выпадак, калі, каб убачыць праблему, далёка ехаць не трэба. І ў Прылуках, і ў Сеніцы, і ў Калодзішчах з Бараўлянамі флікеры насіць не любяць. Але да пары: як у народзе кажуць, пакуль певень смажаны не клюне.

— Некаторыя грамадзяне яшчэ не перастроіліся, што надышоў перыяд, калі трэба раней, чым звычайна, насіць святлоадбівальныя элементы, — заўважае **старшы інспектар дарожна-патрульнай службы спецыяльнага падраздзялення па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху Дзяржаўтаінспекцыі Мінскай вобласці капітан міліцыі Павел КРУЦЬКО.** — Невыпадкова, калі на працягу года мы першы раз спыняем чалавека, які ідзе ўздоўж дарогі без флікера, адміністрацыйны пратакол не складаецца. Мы выносім грамадзяніну папярэджанне, якое фіксуецца ў нашай базе, каб наступны раз, калі пешаход парушыць правілы дарожнага руху, мы добра ведалі: быў ён дагэтуль папярэджаны ці не. Калі ж неабазначаны пешаход трапляе ў поле нашага зроку паўторна на працягу года, яму ўжо выносіцца штраф у памеры ад адной да трох базавых велічынь.

### ФЛІКЕР ПАТРЭБНЫ І Ў ВЁСЦЫ, І Ў ГОРАДЗЕ

Неўзабаве заўважаем маладую пару, якая ідзе па абочыне, хоць на тым баку дарогі ёсць тратуар.



— Добры вечар! Дзе вашы флікеры? — звяртаецца да пешаходаў **інспектар дарожна-патрульнай службы спецыяльнага падраздзялення па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху Дзяржаўтаінспекцыі Мінскай вобласці лейтэнант міліцыі Уладзіслаў РУБАШНЫ.**

— У сумцы забылася, а яна дома, — вінавата ўсміхаецца жанчына.

— Чаму не ідзяце па тым баку вуліцы, дзе ёсць тратуар? — цікавіцца міліцыянер.

— Мы нават не ведалі, што яго ўжо там праклалі: забудова новая, таму яшчэ некалькі дзён дагэтуль тратуара там не было, — тлумачыць Алена.



Пакуль супрацоўнік ДАІ правярае па базе, ці былі ў жанчыны і яе мужа, з якім яны акурат і трапілі на вочы міліцыянерам, правапарушэнні, звязаныя з адсутнасцю флікера, маладыя людзі кажуць, што выйшлі на прагулку перад сном. Яшчэ нядаўна жылі ў Мінску, таму такой праблемы, як абазначаць сябе ў цёмны час сутак святлоадбівальнымі элементамі, не мелі. Нядаўна пераехалі за кальцавую, а вось пра бяспеку задумацца пакуль не паспелі.

Высветлілася, што за адсутнасць флікераў пешаходы ніколі да адказнасці не прыцягваліся. І сённяшняе папярэджанне ў іх сапраўды першае. Пакуль запаўняюцца адпаведныя дакументы, пешаход Уладзімір заўважае, што вуліца, па якой яны ідуць, амаль неасветленая (вуліца Міру ў аграгарадку Прылукі. — **Заўв. аўт.**). «Няма ліхтароў нават каля пешаходнага перахода: калі еду ў гэтым месцы на машыне, заўжды вельмі ўважлівы, — удакладняе мужчына. — Ды і пешаходны пераход тут усяго адзін на вялікі ўчастак дарогі. Не раз заўважаў, як у неўстаноўленым месцы пераходзяць дарогу і мамы з калясками, і нават пажылыя людзі».

Падзякаваўшы Алене і Уладзіміру, узяўшы на кантроль іх заўвагі, развітваемся. З гэтага часу, перш чым выйсці прагуляцца, яны абавязкова надзенуць флікеры. Тым больш што іх супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі пешаходам тут жа ўручылі.

### НА ДАРОЗЕ — ДЗЕЦІ!

Разам з экіпажам рухаемся далей. Пакуль едзем, супрацоўнікі дарожна-патрульнай службы ўдакладняюць, што і ў горадзе шмат выпадкаў, калі без святлоадбівальных элементаў не абысціся. Нават у сталіцы ёсць участкі дарог, дзе адсутнічаюць тратуары.

> «Тыповы загінулы пешаход на тэрыторыі Мінскай вобласці — мужчына 30—40, які ішоў уздоўж праезнай часткі або па самой дарозе без святлоадбівальнага элемента, акрамя таго, у нецвярозым стане».

— Строгіх правілаў, як насіць флікеры, няма: галоўнае, каб чалавека было відаць і спераду, і ззаду, — акцэнтуе ўвагу Павел Круцько. — Лепш за ўсё, калі пешаход будзе апрануты ў адзенне з ушытымі святлоадбівальнымі элементамі. Калі гэта нарукаўная павязка, дастаткова яе павесіць на перадплечча, і чалавек будзе прагледжвацца з абодвух бакоў. Флікер на сумцы — не выхад: ён лёгка закрываецца, таму не заўсёды эфектыўны.

Заўважаем на дарозе падлеткаў. Хлопец едзе на веласіпедзе, дзяўчаты ідуць побач з ім. Ні ў кога з дзяцей няма флікераў! Навокал — цемра, дзесьці ўдалечыні «сумуе» адзінокі ліхтар. Машына супрацоўнікаў ДАІ рухаецца на мінімальнай хуткасці, а калі б на дарозе з'явіўся кіроўца, які едзе дазволеныя 60 кіламетраў у гадзіну. А калі б увогуле ліхач?!

Школьнікі, мяркуючы па размове, наступствы сваіх вечаровых прагулак мала разумеюць. Пра флікеры яны, вядома, чулі. І не раз. Аднак чаму святлоадбівальных элементаў не аказалася на іх, патлумачыць не змаглі.

— А дзе катафоты на тваім веласіпедзе? — з надзеяй на больш-менш прыстойны адказ звяртаецца да хлопца Уладзіслаў Рубашны.

Аднак і тут — маўчанне. Правёўшы прафілактычную гутарку, уручыўшы кожнаму па флікеры, а таксама атрымаўшы абяцанне больш ніколі ў цёмны час неабазначанымі не хадзіць, падлеткаў адпусцілі дамоў.

Інспектары ДПС адзначаюць: дзеці без флікераў на дарозе — рэдкасць. Сённяшняя сітуацыя — з разраду выключэнняў. Праваахоўнікі кажуць, што дзеці ў гэтым плане больш свядомыя, чым дарослыя. Тлумачыцца такая адказнасць прафілактычнымі мерапрыемствамі, якія супрацоўнікі міліцыі рэгулярна праводзяць ва ўстановах адукацыі.

### ЛІХТАРЫК — НЕ ВЫЙСЦЕ

За вечар нашага сумеснага дзяжурства яшчэ давялося спыніць некалькіх неабазначаных пешаходаў. Усіх папярэдзілі аб адказнасці, кожны атрымаў ад супрацоўнікаў ДАІ па флікеры.

— Тыповы загінулы пешаход на тэрыторыі Мінскай вобласці — мужчына 30—40, які ішоў уздоўж праезнай часткі або па самой дарозе без святлоадбівальнага элемента, акрамя таго, у нецвярозым стане, — заўважае капітан міліцыі Павел Круцько.

Калі ўжо так выйшла, што вы выправіліся ў дарогу і не ўзялі з сабой флікер (хоць цяпер яго можна набыць у любой краме), каб абазначыць сябе ў цемры, можна ўключыць на тэлефоне ліхтарык. Аднак, як падкрэсліваюць прадстаўнікі Дзяржаўтаінспекцыі, гэта не выход: маленькі агеньчык на тэлефоне будзе складана заўважыць кіроўцу. Святлоадбівальны ж элемент бачны здалёк, прычым ён не мае батарэйкі: адзін раз яго адзень, і ён будзе служыць табе ў любы час дня і ночы. І тады дакладна — за сваю бяспеку на дарозе можна не хвалявацца.

**Вераніка КАНЮТА,**
**фота аўтара.**

*Мінскі раён.*

У тэму

### ВАКАЦЫІ БЕЗ НЕПРЫЕМНАСЦЯЎ

**Падчас канікулаў колькасць аўтаавары з удзелам непаўналетніх традыцыйна расце. З мэтай прафілактыкі ДТЗ з удзелам дзяцей з 27 кастрычніка да 7 лістапада Дзяржаўтаінспекцыя Мінскай вобласці ладзіць акцыю «Бяспечныя канікулы».**

Супрацоўнікі ДАІ правядуць інфармацыйна-тлумачальныя размовы ва ўстановах адукацыі, працоўных калектывах, арганізацыях і на бацькоўскіх сходах. Як дзецям, так і дарослым супрацоўнікі міліцыі патлумачаць правілы бяспечных паводзін у транспарце, на дарозе, дваровых тэрыторыях. Інспектары ДПС нагадаюць, як правільна пераходзіць праезную частку па пешаходных пераходах, наколькі важна насіць флікеры, раскажуць, да чаго прыводзіць карыстанне навушнікамі і гаджэтамі падчас руху на дарозе.

Дзеля бяспекі

# ПАД АХОВАЙ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

## Усе сталічныя школы — на кантролі Міністэрства ўнутраных спраў

**У верасні ўвесь свет ускалыхнула навіна: малады чалавек уварваўся ў Пермскі ўніверсітэт і расстраляў шэсць чалавек. Усяго за тры месяцы да гэтага амаль яго равеснік адкрыў агонь у казанскай школе: забойца пазбавіў жыцця семярых дзяцей і дзвюх настаўніц, 24 чалавекі былі паранены. На днях падлетак адкрыў стральбу ў Пермскім краі: на шчасце, абышлося без ахвяр. Падобная трагедыя два гады таму здарылася і ў нас: у Стоўбцах дзесяцікласнік нанёс удары нажом вучню і настаўніцы — ад атрыманых раненняў яны загінулі на месцы. Сярод белага дня, на вачах у школьнікаў адбылося нябачанае дагэтуль у суверэннай Беларусі злачынства...**

Пасля трагедыі ў райцэнтры многія навучальныя ўстановы краіны ўзмацнілі прапускны рэжым. Там, дзе дагэтуль не было аховы, яна з'явілася. Супрацоўнікі ВНУ, сярэдніх спецыяльных устаноў, школ і нават дзіцячых садкоў пачалі рэагаваць на прысутнасць у адміністрацыйных будынках старонніх людзей. Асаблівую ўвагу сталі звяртаць на тых, хто неадэкватна сябе паводзіць.

З новага вучэбнага года ў сталіцы — увогуле ноу-хау. Мінскія школы, без выключэння, перайшлі пад кантроль Міністэрства ўнутраных спраў. З першага верасня ўсіх тых, хто ідзе сюды як вучыцца, так і выкладаць, на парозе сустракаюць супрацоўнікі Дэпартамента аховы. Якім чынам цяпер трапляюць у школы бацькі, а таксама староннія людзі, якім гэта неабходна, як увогуле функцыянуе сістэма бяспекі ў сярэдніх навучальных установах, карэспандэнты «Звязды» высвятлялі на прыкладзе сярэдняй школы № 61 Мінска.

### «ПРАД'ЯВІЦЕ ПРОПУСК!»

Пры падыходзе да школы разумееш: навучальная ўстанова была пабудавана нядаўна. Вялізны будынак, прыгожы фасад, сучасныя спартыўныя і дзіцячыя пляцоўкі на тэрыторыі — усё сведчыць аб тым, што школе не больш за дзесяць гадоў. Знаходзіцца ўстанова адукацыі побач з адным з найбуйнейшых сталічных жылых комплексаў «Маяк Мінска»: на яго юных жыхароў, відаць, у асноўным і разлічана.

**Людзей праз школу праходзіць шмат, а адпаведна работы для міліцыянераў на пасту хапае. І гэта нягледзячы на электронную прахадную і картку, якая ёсць у кожнага навучэнца. Калі ў школу хоча трапіць хтосьці з бацькоў або староннні наведвальнік, ахова павінна дакладна зразумець мэту візіту, а прапусціўшы чалавека ў будынак, ацаніць: у якім ён стане, як выглядае, як сябе паводзіць. Толькі потым ажыццяўляецца запіс у журнал уліку наведвальнікаў.**

Праз прыгожы ўтульны дворык набліжаемся да ўваходу. Цягнем за ручку, а дзверы не адчыняюцца. Націскаем на кнопку (сістэма нагадвае дамафон). «Вы да каго? Мэта прыходу?» — пытаюцца на тым баку сувязі. «Мы карэспандэнты, дырэктар у курсе нашага візіту», — адказваем. Дзверы адчыняюцца, але і тут перашкода — турнікеты, перадолець якія пад сілу толькі ўладальнікам электронных пропускаў. У нас іх, вядома, няма. Паколькі дзяжурныя ведаюць, навошта мы сюды прыйшлі, прапускаюць. Праўда, чакаць дырэктара прапаноўваюць тут жа, на пасту аховы. Як і ўсіх наведвальнікаў школы, за выключэннем вучняў і настаўнікаў, нас рэгіструюць у спецыяльным часопісе — добра, што ўзялі з сабой пашпарты. А калі б і забыліся, падыдзе любы дакумент, які пацвярджае асобу.

— Школа функцыянуе восьмы год, — з парога знаёміць з установай **дырэктар 61-й школы Ірына ЦУБІКАВА**. — У адукацыйным працэсе задзейнічана 1700 дзяцей. Навучанне адбываецца ў адну змену. Функцыянуе 11 груп падоўжанага дня (а гэта каля 250 дзяцей). Каля 700 школьнікаў ахоплена дадатковай адукацыяй: заняткі ў гуртках, секцыях, у басейне. На базе школы займаюцца гульцы баскетбольнага клуба «Цмокі», валейбольнага клуба «Мінск», функцыянуе фізкультурна-спартыўны цэнтр дзяцей і моладзі Першамайскага раёна (секцыя па біятлоне) — другая палова дня таксама ахоплена вялікай колькасцю людзей. Акрамя таго, дзейнічае абанементная сістэма ў басейн для грамадзян.

### ЗАБЫЎСЯ КАРТКУ? НЕ БЯДА!

Пост аховы ў 61-й школе працуе ўжо трэці год. Пасля ўвядзення прапускнога рэжыму кантроль ва ўстанове адукацыі стаў ажыццяўляцца больш пільна. Сёлета непрафесійных вартаўнікоў змянілі супрацоўнікі Дэпартамента аховы МУС, што толькі ўзмацніла яго якасць.

Людзей праз школу праходзіць шмат, а адпаведна работы для міліцыянераў на пасту хапае. І гэта нягледзячы на электронную прахадную і картку, якая ёсць у кожнага навучэнца. Калі ў школу хоча трапіць хтосьці з бацькоў або староннні наведвальнік, ахова павінна дакладна зразумець мэту візіту, а прапусціўшы чалавека ў будынак, ацаніць: у якім ён стане, як выглядае, як сябе паводзіць. Толькі потым ажыццяўляецца запіс



Фота Алены МАЗАВЕЦ.

у журнал уліку наведвальнікаў.

— Калі ў школьніка скончыўся тэрмін дзеяння карткі або хтосьці страціў ці забыўся свой пропуск, вядома, на занятки такі вучань трапіць: дастаткова назваць сваё прозвішча, і я праверу такога навучэнца па базе, — удакладняе **міліцыянер батальёна міліцыі Першамайскага аддзела (горада Мінска) Дэпартамента аховы прапаршчык міліцыі Мікіта МАЛЫШАЎ.** — Часта звяртаюся па дапамогу да дырэктара: Ірына Віктараўна заўсёды падкажа, як завуць таго ці іншага навучэнца, у якім ён класе вучыцца.

Мікіта Малышаў у Дэпартаменце аховы служыць нядаўна. Ён па адукацыі, дарэчы, педагог, заўсёды марыў насіць пагоны. У Дэпартаменце аховы доўгі час працаваў яго бацька, які шмат цікавага расказваў сыну аб сваёй прафесіі. У выніку вырашыў паспрабаваць свае сілы і Мікіта. Цяпер замест таго, каб працаваць у школе настаўнікам фізкультуры, ён адказвае тут за бяспеку.

Да ахоўніка звяртаюцца і тады, калі трэба знайсці страчаную рэч. Часта школьнікі губляюць мабільныя тэлефоны. «Бывае, што дзіця нават яшчэ не паспее нам паведаміць аб гэтым, як згубленую рэч нам ужо перадаюць іншыя вучні», — кажа Мікіта.

— Напэўна, у першакласнікаў узнікаюць цяжкасці пры пераадоленні турнікетаў? — цікаўлюся ў міліцыянера.

— Акурат наадварот: першакласнікі больш адказныя, чым вучні старэйшых класаў, і імкнуцца быць самастойнымі, — лічыць прапаршчык. — Ім усё цікава, таму з энтузіязмам ставіцца да ўсяго новага.

### «МЫ СПАКОЙНЫЯ ЗА ДЗЯЦЕЙ»

Бліжэй да абеду каля турнікетаў становіцца шматлюдна: каб забраць сваіх дзяцей (звычайна першакласнікаў), у школу прыходзяць бацькі. Чакаюць сваіх школьнікаў і бабулі. Некаторыя па тэлефоне паведамляюць нашчадкам, што ўжо на месцы. Іншыя сціпла чакаюць: малыя ведаюць, хто і ў колькі па іх прыйдзе.

Сваю ўнучку-другакласніцу кожны дзень пасля ўрокаў забірае Святлана Сапун. Затым бабуля вядзе дзяўчынку ў музычную школу. Бацькі школьніцы працуюць, а Святлана Яўгенаўна на пенсіі: хто ж, як не яна, дапаможа сваім дзецям. Нягледзячы на ўзрост, да новай прапускной сістэмы ў школе жанчына прызвычаілася хутка.

— Калі ў школу хадзілі мае дзеці, пра бяспеку мала хто задумваўся, — заўважае Святлана Сапун. — Цяпер іншы час. Тое, што міліцыя пастаянна знаходзіцца ў школе, — гэта добра. Мы спакойныя за нашых школьнікаў. Дарэчы, прысутнасць чалавека ў пагонах вельмі дысцыплінуе дзяцей. Гэта ім толькі на карысць.

Такога меркавання прытрымліваецца і Аксана Алдакушына, якая таксама забірае са школы сваю ўнучку. «Час дыктуе свае правілы, — мяркуе жанчына. — Раней не было забойстваў у школах, ніхто не чуў пра гандаль дзецьмі, да нядаўняга часу мы не ведалі і што такое ковід. Некаторых, як паказваюць назіранні, прапускны рэжым напружвае — нашых людзей вельмі складана прывучыць да парадку. Я толькі за турнікеты, ахову і бяспеку. У мяне старэйшая ўнучка вучыцца ў Чэхіі. Там ужо даўным-даўно ніхто староннні не ходзіць у школу».

**Такога меркавання прытрымліваецца і Аксана Алдакушына, якая таксама забірае са школы сваю ўнучку. «Час дыктуе свае правілы, — мяркуе жанчына. — Раней не было забойстваў у школах, ніхто не чуў пра гандаль дзецьмі, да нядаўняга часу мы не ведалі і што такое ковід. Некаторых, як паказваюць назіранні, прапускны рэжым напружвае — нашых людзей вельмі складана прывучыць да парадку. Я толькі за турнікеты, ахову і бяспеку. У мяне старэйшая ўнучка вучыцца ў Чэхіі. Там ужо даўным-даўно ніхто староннні не ходзіць у школу».**

Аднак бацькоўскія сходы ніхто не адмяняў. Яны праводзяцца па графіку. Адначасова бацькі ўсіх навучэнцаў, як гэта было раней, не збіраюцца, хоць магчымасці школы дазваляюць.

Сітуацыі, вядома, бываюць розныя. Часта дзеці нешта не дагаворваюць, хлусяць, узнікае падазрэнне, што яны прапускаюць заняткі... Высветліць, у чым справа, можна толькі падчас размовы з настаўнікам або класным кіраўніком. А як такім чынам трапіць у школу?

— Тут мы працуем у залежнасці ад сітуацыі, — удакладняе прапаршчык міліцыі Мікіта Малышаў. — Калі хтосьці з бацькоў прыйшоў для таго, каб параразмаўляць з настаўнікам свайго дзіцяці, да паста аховы мы выклікаем педагога. Як правіла, гэта адбываецца па дамоўленасці, і настаўнік ужо чакае наведвальніка. Калі хтосьці прыйшоў забраць дзіця з групы падоўжанага дня (кіраўніцтва настойвае, каб вучняў з прадлёнкі абавязкова забіралі, бо гэта ўжо другая палова дня, а адпаведна раней цямнее), то ён праходзіць у групу. На выхадзе чалавек кажа аб тым, што сыходзіць, і яго выпісваюць з журнала ўліку наведвальнікаў. Каб трапіць у басейн, грамадзянін паказвае абанемент, падпісаны дырэктарам школы. Акрамя таго, асобу чалавека мы звяраем са спісам людзей, якія займаюцца на базе школы. Кожны, хто пераступае парог школы, адразу трапляе пад кантроль: мы абавязкова павінны ведаць, куды і з якой мэтай чалавек ідзе.

### «СТОП! ТУТ ТЭРЫТОРЫЯ ДЗЯЦІНСТВА!»

Трэба адзначыць, што вартаўнікі з грамадзянскага персаналу з навучальнай установы нікуды не сышлі. Гэта таксама прафесіяналы сваёй справы, якія прайшлі акрэдытацыю і навучанне ў Дэпартаменце аховы. Школа вялікая, таму работы хапае ўсім.

— Прахадны рэжым не навіна, — падкрэслівае Ірына Цубікава. — Ён функцыянуе ўжо некалькі гадоў, і на высокім узроўні. Тое, што нашы супрацоўнікі перайшлі ў Дэпартамент аховы, — крок, які гарантавана павысіў узровень бяспекі. Сітуацыя стала больш кантраляваная. Гэта двайны фільтр, двайны бар'ер — не столькі фізічны, колькі маральны. Турнікет спыняе чалавека і без слоў кажа: «Стоп! Тут зона дзяцінства!» Гэта дысцыплінуе ўсіх людзей, у тым ліку тых, хто можа нанесці шкоду.

Дырэктар школы перакананая, што гэтая сістэма, безумоўна, дадасць плюсоў у выхаванне дзіцяці. «Яна патрабуе ад навучэнца педантычнасці, уважлівасці, бо картку забыць нельга, — удакладняе Ірына Віктараўна. — Дзякуючы прапускной сістэме сталі больш кантраляванымі спазненні, што павышае ўзровень і без таго адказных дзяцей. Гэта яшчэ адзін з кірункаў прававога выхавання».

Настаўнікі трапляюць у школу праз службовы ўваход. Там таксама функцыянуе прапускная сістэма. Ажыццяўляецца відэакантроль. У мэтах бяспекі фіксуецца выдача ключоў.

Тое, што ніхто не зойдзе і не выйдзе са школы незаўважаным, вядома, — добра. Адправіўшы дзяцей вучыцца, бацькі гарантавана могуць быць упэўненыя, што іх нашчадкі знаходзяцца ў абсалютнай бяспецы. Той, хто думае, што зачыненая прастора ставіць пад пагрозу пажарную бяспеку, можа не сумнявацца: і тут усё пад кантролем. У школе ўстаноўлена сістэма электронна-магнітных замкоў, якая выведзена на пункт аховы. У выпадку неабходнасці ўсе дзверы аўтаматычна разблакіроўваюцца, і з кожнага выхаду па эвакуацыйных шляхах без ніякіх перашкод могуць ісці дзеці.

**Вераніка КАНЮТА.**

## Извещение о проведении 11 ноября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия и копию учредительных документов.

Организатор аукциона, опубликовавший извещение, вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения, вправе снять объект с аукционных торгов в любое время до объявления его проданным

Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся в случаях если:

- заявление на участие в нем подано менее чем двумя участниками;
- перед началом торгов у организатора торгов зарегистрированы и обменяли билеты участников торгов на аукционные (конкурсные) номера менее чем два участника.

В случае если аукцион призван не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии приобрести лот по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Победитель аукциона обязан: подписать протокол в день аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона на указанный в протоколе текущий (расчетный) банковский счет в течение трех рабочих дней, со дня проведения аукциона, заключить с продавцом договор купли-продажи имущества в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона;

Срок оплаты имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона определен Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов, находящихся в собственности ОАО «Пинский ГКБО», согласованной наблюдательным советом ОАО «Пинский ГКБО» протокол № 2 от 07.04.2016 г.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Центральная, 15б, по рабочим дням в рабочее время с 8.00 до 13.00. и с 13.30 до 16.30 по 01 декабря 2021 г. включительно.**

Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

С более подробной информацией об условиях проведения и участия в аукционе можно ознакомиться по тел.: 628422; 631859; 80296632928 или непосредственно в дирекции ОАО «Пинский ГКБО» по адресу: г. Пинск, ул. Центральная, 15б.

# ОАО «ПИНСКИЙ ГКБО»
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-42159 площадью 82,1 м²** **(назначение: помещение неустановленного назначения, наименование: офис № 1)** |
| **Характеристика объекта** | Изолированное помещение, наименование офис № 1, 2007 года постройки, площадью 82,1 м², материал стен – кирпич блоки, полы – бетонные, плитка, проемы оконные – стеклопакеты, проемы дверные – ПВХ, МДФ |
| **Местонахождения объекта** | 225710, г. Пинск, ул. Завальная, 29, пом. 1 |
| **Продавец и организатор торгов** | ОАО «Пинский ГКБО» 225710, г. Пинск, ул. Центральная, 15б, тел./факс 62-84-20 |
| **Начальная цена продажи** | 153 600,00 (сто пятьдесят три тысячи шестьсот рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 15 360 (пятнадцать тысяч триста шестьдесят рублей) |
| **Шаг аукциона** | 10 % |
| **Условия продажи** | Без условий |

**Аукцион состоится 02 декабря 2021 г. в 10.00 по адресу: г. Пинск, Центральная, 15б, кабинет директора.**

Для участия в аукционе организатору аукциона подается заявление по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет BY17PJCB30125200201000000933 «Приорбанк» ОАО ЦБУ 506, МФО PJCBBY2X, г. Пинск, ул. Ленина, 7; УНП 200278370; срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе.
- физическим лицом – ксерокопия паспорта;
- юридическим лицом РБ или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, копия учредительных документов без нотариального засвидетельствования;
- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитной финансовой организацией, при необходимости, легализованной в уставленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- представителям заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия и копию учредительных документов.

Организатор аукциона, опубликовавший извещение, вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения, вправе снять объект с аукционных торгов в любое время до объявления его проданным

Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся в случаях если:

- заявление на участие в нем подано менее чем двумя участниками;
- перед началом торгов у организатора торгов зарегистрированы и обменяли билеты участников торгов на аукционные (конкурсные) номера менее чем два участника.

В случае если аукцион призван не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии приобрести лот по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Победитель аукциона обязан: подписать протокол в день аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона на указанный в протоколе текущий (расчетный) банковский счет в течение трех рабочих дней, со дня проведения аукциона, заключить с продавцом договор купли-продажи имущества в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты за имущество – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона определен Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов, находящихся в собственности ОАО «Пинский ГКБО», согласованной наблюдательным советом ОАО «Пинский ГКБО» протокол № 2 от 07.04.2016 г.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Центральная,15б, по рабочим дням в рабочее время с 8.00 до 13.00 и с 13.30 до 16.30 по 01 декабря 2021 г. включительно.**

Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

С более подробной информацией об условиях проведения и участия в аукционе можно ознакомиться по тел.: 628422; 631859; 80296632928 или непосредственно в дирекции ОАО «Пинский ГКБО» по адресу: г. Пинск, ул. Центральная, 15б.

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

# ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Минское областное управление № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | Изолированное помещение с инвентарным номером 643/D-5353, расположенное по адресу: Минская область, Любанский р-н, аг. Осовец, ул. Советская, 44-2, общей площадью 62,6 кв. м |
| **Начальная цена продажи** | 4154,54 бел. руб. (четыре тысячи сто пятьдесят четыре рубля 54 копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 207,73 бел. руб. |
| **Дата проведения аукциона** | **Время 11.00, 06.12.2021** |
| **Сроки и место подачи документов на участие** | **До 16.00 02.12.2021 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 108** |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: 8 (017) 2214030, 8 (029) 198-19-17 |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
***(организатор аукциона)***
**по поручению ОАО «Солигорскторг» *(продавец)***
**проводит повторный открытый аукцион**

## по продаже помещения магазина № 34

*(составные части и принадлежности: пристройка из металлопрофиля с металлической крышей, навес с ж/бетонной крышей на металлических столбах, рампа бетонная с ж/бетонным навесом на металлических столбах, крыльцо бетонное)*

**с инв. № 644/D-30188 общей площадью 770,7 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Козлова, 58А, и**

## системы автоматической пожарной сигнализации

**(инв. № по бух. учету 34-169).**

**Сведения о земельном участке: кадастровый номер 625050100001002601, площадь 0,2459 га, доля в праве – 11/50.**

**Начальная цена с НДС (20 %)** – **534 144,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **53 414,40** бел. руб.). *(Цена снижена на 35 %).*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер-Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата производится в следующем порядке:

- 40 (сорок) процентов стоимости имущества оплачивается в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора с возможной рассрочкой оплаты оставшихся 60 (шестидесяти) процентов – в течение 3 (трех) календарных месяцев (по 20 %) с учетом ежемесячной индексации цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь либо по соглашению между сторонами на иных условиях договора.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере – 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона (Объекта).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 19.05.2021, 01.07.2021, 17.08.2021, 12.10.2021.

Аукцион состоится **15.11.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.11.2021 г.** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**

УНН 600122715

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.

Продавец: **ООО «КУБИТЕК ЖЕЛЕЗОБЕТОН»** (УНП 192626882), 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65Б, пом. 129, оф. 1409, к. № 3.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **16 ноября 2021 г. 09 00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | 1/4 доля в праве собственности на изолированное помещение-машиноместо с инвентарным номером № 500/D-7026803 площадью 235,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 65Б-202 | 66918,00 |
| 2 | 1/16 доля в праве собственности на изолированное помещение-машиноместо с инвентарным номером № 500/D-7024541 площадью 461,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 65Б-202 | 32718,00 |
| 3 | Бетоносмесительная установка фирмы Либхерр тип Compactmix 1.0 A-R 2008 г., в комплекте бункерная сырья, сети, технологическая площадка | 573545,40 |
| 4 | Силос для хранения цемента 90 куб. м диаметр 3 м, высота 13м, № 21, углеродистая сталь, оборудован лестницей и датчиками наличия цемента | 41724,00 |
| 5 | Силос для хранения цемента 90 куб. м диаметр 3 м, высота 13 м, № 22, углеродистая сталь, оборудован лестницей и датчиками наличия цемента | 41724,00 |
| 6 | Автобетоносмеситель DAF CF75/310 Manual Euro4 объем бочки 6 куб. м, № XLRAT75PCOE812014, 2008 г. в. | 80712,00 |
| 7 | Автобетоносмеситель DAF CF75/310 Manual Euro4 объем бочки 6 куб. м, № XLRAT75PCOE812690, 2008 г. в. | 76494,00 |

**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 6985353.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 01.11.2021 г. 09.00 по 15.11.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 02.10.2021 г.

# ТЭСТ НА «КАЛЬМАРА»



## Чаму паўднёвакарэйскі серыял скарыў увесь свет?

**Серыял «Гульня ў кальмара» (Squid Game) выйшаў на экраны 17 верасня і амаль адразу стаў ашаламляльным феноменам у сеціве. Хэштэг #SquidGame ў ТікТок набраў больш за 22 мільярды праглядаў. На радзіме — ў Паўднёвай Карэі — карціна нават стала прычынай праблем з інтэрнэт-злучэннем. Мясцовы правайдар SK Broadband падаў у суд на стваральнікаў серыяла — платформу Netflix. Прычына іску — неверагодны скачок сеткавага трафіку з-за стужкі і, як вынік, павышэнне выдаткаў на абслугоўванне. Чаму паўднёвакарэйскі серыял скарыў увесь свет?**

### ГУЛЬНЯ НА ВЫЖЫВАННЕ

Паўднёвакарэйская драма-антыўтопія «Гульня ў кальмара» стала самым папулярным серыялам Netflix за ўсю гісторыю, сабраўшы 111 мільёнаў прыхільнікаў у больш за 90 краінах за нейкія чатыры тыдні. Асноўнае дзеянне серыяла разгортваецца ў гіганцкім сакрэтным комплексе на безыменным востраве Паўднёвай Карэі, куды прывозяць 456 чалавек, якія па розных прычынах апынуліся на абочыне жыцця. Яны вымушаны падманваць, здраджваць і нават забіваць адзін аднаго дзеля грошай. Гэтыя людзі становяцца ўдзельнікамі смяротнага шоу, правілы якога простыя: для перамогі трэба прайсці праз шэсць выпрабаванняў, запазычаных на дзіцячых гульнявых пляцоўках: ад перацягвання каната да «паволі едзеш — далёка станеш». Тых, хто прайграе, чакае адна доля — смерць, у той час як пераможца атрымае прыз у памеры 4,56 мільярда вон (каля $38 млн).

Кожны з удзельнікаў гульні становіцца закладнікам не толькі сваіх учынкаў, але і непрадбачаных акалічнасцяў. Апынуўшыся на мяжы роспачы і літаральна на валаску ад смерці, яны бачаць адзінае выйсце — удзел у гульнях на выжыванне. «Я планаваў стварыць алегорыю або байку аб сучасным капіталістычным грамадстве. Але хацеў, каб у ім былі персанажы, якіх мы ўсе сустракалі ў рэальным жыцці. Намаляваныя гульні вельмі простыя і зразумелыя. Гэта дазваляе гледачам засяроджвацца на персанажах, а не адцягвацца на спробы інтэрпрэтаваць правілы», — раскрывае сэнс задуманага рэжысёр і аўтар сцэнарыя серыяла Хван Дон-хек.

Ан Ён-хуэй, вулічны гандляр з Сеула, які рабіў далгонас — печыва ў выглядзе сот, паказанае ў серыяле, расказаў, што фанаты пачынаюць выстройвавацца ў чаргу да яго вулічнай кухні ў 11 гадзін раніцы, і зараз ён прадае 500 штук у дзень (да выхаду серыяла гэтая колькасць не падымалася вышэй за 200 у дзень). Фанаты шоу змялі з прылаўкаў белыя сліпоны Vans, якія носяць героі серыяла. І, мяркуючы па ўсім, самым папулярным гарнітурам на Хэлоўін-2021 стане зялёная спартоўка, а самым распаўсюджаным конкурсам — выдрапванне постацяў з цукровага печыва. Абапіраючыся на поспех серыяла «Гульня ў кальмара» і фільма «Паразіты», а таксама поп-гуртоў BTS і Blackpink, віцэ-прэзідэнт Netflix па кантэнце ў Карэі Мінён Кім сказала, што «гледачы ва ўсім свеце ўлюбляюцца ў карэйскія гісторыі, мастакоў і культуру». У апошнее дзесяцігоддзе карэйскія музыка, кіно, ежа, дызайн і тэхналогіі захапілі свет, а Паўднёвая Карэя аказалася ў цэнтры ўсеагульнай увагі.

### СТАЎКА НА КАНТЭНТ

Экспарт кантэнту з Паўднёвай Карэі вырас у перыяд пандэміі каранавіруса, а серыял «Гульня ў кальмара» і мясцовы k-pop бойзбэнд BTS, які стаў самым папулярным на Netflix ва ўсім свеце, узнялі культурны ўплыў на новы ўзровень, стаўшы выратаваннем для эканомікі азіяцкай краіны. Аб гэтым паведаміў Bloomberg. У мінулым годзе яе культурны экспарт склаў 10,8 мільярда долараў — прыкладна адна дзясятая частка паставак паўправаднікоў, якія з'яўляюцца адной з асноўных крыніц заробку дзяржавы.

Пры гэтым на вытворчасці кантэнту Карэя зарабляе больш, чым на ключавых таварах для экспарту — бытавой тэхніцы і касметыцы. Кошт карэйскага экспарту забаў, уключаючы выдавецкую справу, гульні, музыку, фільмы і серыялы, летась павялічыўся на 6,3 працэнта. Згодна са справаздачай Карэйскага фонду міжнароднага культурнага абмену, пастаўкі за мяжу самых папулярных спажывецкіх тавараў, такіх як касметыка, адзенне і прадукты харчавання, у 2020 годзе ўзраслі на 5,5 працэнта. Пры гэтым агульны аб'ём экспарту зменшыўся на 5,4 працэнта з-за пандэміі COVID-19.

Індустрыя забаў разам з тэхналагічнай галіной з'яўляецца найбольш хуткарослым сектарам



эканомікі Паўднёвай Карэі. Згодна з афіцыйнымі звесткамі, колькасць работнікаў творчых прафесій узрасла на 27 працэнтаў у перыяд з 2009 да 2019 года. У той жа час у вытворчым сектары — традыцыйным рухавіку эканамічнага росту — шэрагі супрацоўнікаў за той жа перыяд павялічыліся на 20 працэнтаў. Паводле ацэнак KOFICE, у 2019 годзе сярод усіх турыстаў, якія ўязджаюць у Карэю, 13 працэнтаў наведалі краіну з мэтай пазнаёміцца з поп-культурай і наведаць фан-мерапрыемствы. Такі від турызму прынёс краіне 2,7 мільярда долараў.

У перыяд з 2016 да 2020 года Netflix прынёс паўднёвакарэйскай індустрыі забаў 4,7 мільярда долараў — з іх $1,9 млрд прыпадаюць на 2020 год. Кампанія стварыла ў Карэі 16 тысяч працоўных месцаў з поўнай занятасцю ў індустрыі забаў і сумежных галінах. Дарэчы, «Гульня ў кальмара» ўжо прынесла стрымінгавай платформе каля мільярда долараў пры выдатках на яе вытворчасць $21,4 мільёна.

### ПАСЛЯ ГАЛІВУДУ І БАЛІВУДУ

Нягледзячы на пэўныя асаблівасці культуры, карэйскія серыялы сталі папулярнымі ва ўсім свеце. Індустрыя кінавытворчасці ў Карэі — адна з наймацнейшых у свеце і саступае хіба што Галівуду і Балівуду. Карэйскія дарамы (драмы), гістарычныя фільмы і серыялы для падлеткаў здымаюцца пастаянным канвеерам і маюць па некалькі соцень серый. Некаторыя сюжэты пераздымаюцца ў іншых краінах — напрыклад, «Жамчужына палаца» дэманстравалася ў 91 краіне свету.

Усё пачалося напрыканцы 1990-х. Крызіс, які ў 1997—1998 гадах ускалыхнуў азіяцкія рынкі, і небывалы фінансавы прыбытак фільма «Парк юрскага перыяду» прымусілі ўрад Паўднёвай Карэі разгледзець новыя сектары прыбытку для краіны. Таму прэзідэнт Паўднёвай Карэі Кім Дэ Чжун працягнуў распачынанні свайго папярэдніка і зрабіў падтрымку нацыянальнай культуры дзяржаўнай стратэгіяй. Спачатку Мінкульт стварыў бюро для падтрымкі нацыянальных вытворцаў. Пасля ўрад наладзіў і працэс рэгулярнага дзяржаўнага фінансавання кіно і музычнай індустрыі. Зараз манетызацыяй паўднёвакарэйскіх кінапрадуктаў займаецца Міністэрства замежных спраў на геапалітычным узроўні — папулярызацыя ў свеце, а Міністэрства культуры падтрымлівае індустрыю на дзяржаўным мікраўзроўні.

Цікавы факт: даход ад карэйскай кінаіндустрыі складаў менш за 8 мільярдаў у 1998 годзе. Але ён павялічыўся да 132 мільярдаў у 2001-м і ўзляцеў да 172 мільярдаў у 2010-м. Карэйскі кінапрадукт стаў папулярным у Кітаі, Тайвані, В'етнаме і Японіі. Поспех быў такі магутны, што адпаведная прапанова пачала пакараць еўрапейскія і амерыканскія рынкі. На працягу апошняга дзесяцігоддзя ўлады краіны пачалі ператвараць культуру ў элемент «мяккай сілы», лічыць Джон Лай, прафесар Каліфарнійскага ўніверсітэта Берклі, паведаміла economy.24tv.ua.

Цяпер «паўднёвакарэйская хваля» — гэта значна больш, чым проста кіно, музыка, мода, камп'ютарныя гульні або любы іншы карэйскі прадукт. Гэта стыль і лад жыцця, які здолеў знайсці сваіх прыхільнікаў па ўсім свеце. Новую папулярнасць «паўднёвакарэйская хваля» адчула ў 2010 годзе, калі актыўна пачала развівацца эра сацыяльных сетак. Такім чынам, карэйская музыка пачала набываць папулярнасць нароўні з кінапрадуктамі дзякуючы сацыяльным сеткам, у тым ліку YouTube.

Паказальным стаў кліп паўднёвакарэйскага спевака PSY на песню Gangnam Style, які ў літаральным сэнсе зламаў алгарытмы Google і прымусіў унесці карэктывы ў лічыльнікі YouTube. Уся справа ў тым, што кліп спевака стаў першым відэа, якое прагледзелі карыстальнікі больш чым 1 мільярд разоў. Таму, калі пад відэа было 2,15 мільярда праглядаў з алгарытмамі, трэба было нешта рабіць. Цяпер пад ім звыш 4,2 мільярда праглядаў. Да гэтага велізарную папулярнасць, як найболей прагляданыя відэа, выпрабоўвалі кліпы Джасціна Бібера на песню Baby і Лэдзі Гагі Bad Romance. Кліп на песню Gangnam Style літаральна месяц таму — 20 верасня — трапіў у кнігу рэкордаў Гінеса як відэа, якое набрала найбольшую колькасць «лайкаў» у гісторыі YouTube. Цяпер пад відэа іх 22 мільёны.

### БАЛЮЧАЕ МЕСЦА

«Гульня ў кальмара» літаральна наступіла на найбольш балючае месца Паўднёвай Карэі — галечу, велізарную запазычанасць насельніцтва. Падчас пандэміі гэтая з'ява без перабольшання ахапіла ўвесь свет. Месцічы жывуць у межах замкнёнай эканомікі, якая залежыць ад знешніх паступленняў сродкаў. Гэта выклікае проста вар'яцкую канкурэнцыю на рынку працоўнай сілы. Закрэдытаванасць хатніх гаспадарак Паўднёвай Карэі эквівалентная каля 105 % ад ВУП. Такога ўзроўню няма нідзе больш у Азіі. І гэта толькі статыстыка па афіцыйных крэдытах, якая не ўлічвае ценявыя пазыкі.

«У індывідуальным плане гэта азначае, што нават калі вы адкладаеце кожную капейку, якую зарабілі на працягу цэлага года, усё роўна не зможаце пагасіць свой доўг. А колькасць людзей з даўгавымі праблемамі павялічваецца экспанентна», — адзначыў выканаўчы дырэктар аналітычнага цэнтра Real Good Economic Лі Ін Чхол.

Запазычанасць насельніцтва ідзе поруч з разрывам у даходах, які рэзка павялічваецца, ростам беспрацоўя сярод моладзі і павышэннем цэн на нерухомасць у вялікіх гарадах, недаступную для большасці звычайных работнікаў. Як паказвае «Гульня ў кальмара», нечаканае звальненне, няўдалая інвестыцыя або проста нешанцаванне могуць прымусіць людзей звярнуцца да крэдытораў з высокім узроўнем рызыкі і працэнтаў толькі для таго, каб, як кажуць, канцы стачыць на працягу найбліжэйшых некалькіх дзён.

The Guardian прыводзіць у прыклад адчайнае становішча былога праграміста Чоя Юн Су — ён адзін з вялікай колькасці звычайных паўднёвакарэйцаў, якія задыхаюцца ад даўгоў у краіне, дзе ўзяць пазыку гэтак жа проста, як купіць кубак кавы. «Мне здаецца, што іншыя людзі лічаць мяне няўдачнікам, таму я выходжу (з малюсенькага пакоя хостэла, у якім жывуць 30 чалавек) толькі ўначы, каб палаліць і паназіраць за бяздомнымі коткамі», — кажа Чой.

Усё, што ён змог знайсці ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, — падпрацоўка дастаўшчыкам на няпоўны працоўны дзень у іншай частцы краіны. Як і многія з 456 выдуманых удзельнікаў Squid Game, якіх запрашаюць пагуляць у карэйскія дзіцячыя гульні і рызыкнуць сваім жыццём дзеля шматмільённага прыза, Чой паглыбіўся ў запазычанасць з жахлівай хуткасцю.

Усяго два гады таму ён працаваў ІТ-інжынерам у фірме ў Пангіа — аналаг Крамянёвай даліны ў Паўднёвай Карэі. Гады звышурочных змен і недахопу сну падарвалі яго здароўе. Пасля доўгіх абмеркаванняў і года, выдаткаванага на планаванне і эканомію, яны разам з жонкай вырашылі адкрыць паб у сваім родным горадзе Інчхон. Пасля абнадзейлівага старту іх бізнес стаў ахвярай пандэміі каранавіруса. Пасля таго як барам і рэстаранам было загадана зачыняцца ўжо ў дзевяць вечара, каб прадухіліць распаўсюджанне віруса, колькасць наведвальнікаў значна скарацілася, а пасля і зусім скончылася.

Пасля нявыплаты арэнднай платы на працягу чатырох месяцаў муж і жонка зразумелі, што выпрабоўваюць цярпенне домаўладальніка, і звярнуліся па дапамогу. Атрымаць банкаўскі крэдыт аказалася на здзіўленне лёгка, але яны былі шакаваныя, выявіўшы, што штодзённая працэнтная стаўка складае 4 %. На працягу некалькіх месяцаў яны ўзялі пазыкі ва ўсіх пяці буйных паўднёвакарэйскіх банках, выкарыстоўваючы свой дом у якасці закладу. Непазбежна даводзілася займаць больш, каб пагасіць існуючыя пазыкі, далучаючыся да доўгіх чэргаў праблемных уладальнікаў бізнесу, якія прагнуць атрымаць наяўныя ад камерцыйных крэдытораў.

Чой кажа, што шмат чуў аб серыяле «Гульня ў кальмара», але не можа яго паглядзець. «За прагляд трэба плаціць, і я не ведаю нікога, хто дазволіў бы мне выкарыстоўваць свой уліковы запіс Netflix, — кажа ён. — У любым выпадку, навошта мне глядзець на кучу людзей з вялізнымі даўгамі? Я магу проста паглядзець у люстэрка».

**Захар БУРАК.**

# БАЧЫЦЬ І РАЗУМЕЦЬ ІНШАГА — ВЕЛЬМІ ВАЖНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Сёння тэма інклюзіі становіцца ўсё больш папулярнай, гэта паказчык культуры, развіцця краіны. Таму што бачыць і разумець іншага — вельмі важна. У мяне быў вопыт работы з асаблівымі людзьмі. І гэта няпроста, трэба мець вялікія веды. Але гэта неабходна рабіць, таму што тэма вельмі актуальная», — падкрэсліла **Ганна ВАШЧЫНЧУК, начальнік аддзела якасці і вучэбна-аналітычнай работы Нацыянальнага агенцтва па турызме.** Падчас выязнога семінара спецыялісты турыстычнай галіны абмеркавалі развіццё інклюзіўнага асяроддзя на аграсядзібах на прыкладзе Валожынскага раёна, які быў абраны невыпадкова.



## ЦІКАВА І ЗРУЧНА

Па-першае, Валожынскі раён сам па сабе цікавы для турыстаў. Яго гістарычная і прыродная жамчужына — Налібоцкая пушча — самы вялікі лясны масіў у краіне. На тэрыторыі раёна размешчана 184 помнікі культуры, архітэктуры і гісторыі. А падругое, Валожынскі раён першы ў Беларусі стаў цалкам адкрытым і даступным для гасцей з інваліднасцю. Сумеснымі намаганнямі Валожынскага райвыканкама і грамадскіх аб'яднанняў «Адпачынак у вёсцы», «Беларускае таварыства інвалідаў» і «Інтэракцыя» быў запушчаны праект «Валожын без бар'ераў». У межах праекта ствараліся ўсе ўмовы, каб людзі з праблемамі зроку, апорна-рухальнага апарату, ментальнымі асаблівасцямі маглі камфортна сябе адчуваць падчас знаёмства з Валожынскім раёнам.

«Да гэтага ў іх не было магчымасці камфортна адпачываць у нашым раёне. Нават у добрых атэлях шмат праблем з безбар'ерным асяроддзем. Звычайна ёсць адзін-два нумары, якія могуць прапанаваць людзям з інваліднасцю. І на гэтым усё. У нашым раёне ёсць на што паглядзець, таму планавалі стварыць умовы, каб ім было дзе пераначаваць. Праект не проста цяжкі, а вельмі цяжкі. Калі мы яго пачыналі, не маглі ўявіць, што нас чакае. Але, дзякуй богу, хапіла светлых галоў, у іх хапіла сіл і ідэй. Гэта быў наш першы вопыт, і, я лічу, мы з задачай справіліся», — падзялілася **Галіна РАЙ, дырэктар Валожынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.**

У 2020 годзе на базе гэтага ТЦСАН у межах праекта «Валожын без бар'ераў» адкрыўся Турыстычны інфармацыйны і рэкрэацыйны цэнтр. Тут створаны ўсе ўмовы, каб госці адчувалі сябе як дома. Адначасова ў прасторных нумарах могуць пераначаваць 20 чалавек. Гардэроб, кухня, душавыя — усё адаптавана пад патрэбы людзей з інваліднасцю. Цэнтр асабліва ганарыцца сучаснай канферэнц-залай, адаптаванай для інвалідаў. Дарэчы, тут праводзіўся круглы стол у межах выязнога семінара Нацыянальнага агенцтва па турызме, і спецыялісты высока ацанілі залу.

Дзякуючы праекту «Валожын без бар'ераў» у Валожынскім раёне былі распрацаваны сем турыстычных маршрутаў. У некаторых з іх уваходзіць наведванне аграсядзіб, якія прапануюць пяць даступных рэкрэацыйна-адукацыйных праграм для людзей з інваліднасцю.

Маршрут «Налібоцкае кола» ўключае водныя, конныя і веласіпедныя прагулкі. На аграэкасядзібе «Налібоцкія васількі» можна пазнаёміцца з музеем коннага транспарту і нават атрымаць урокі верхавой язды. Экалагічная сцежка «Валожынскія гасцінцы» адкрые ўсю прыгажосць і характо прыроды гэтага краю. А на сядзібе «За масточкам», размешчанай на беразе Сакоўшчынскага вадасховішча, гасцей чакаюць майстар-класы па рыбнай лоўлі, падводным плаванні і рыбалцы. Недалёка ад сядзібы размешчана пляцоўка для назірання за птушкамі, якая карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод турыстаў. Яна абсалютна безбар'ерная і таму паназіраць за крылатымі тут можа кожны. Акрамя гэтага, на сядзібе створана плывучая платформа, усталяваны пантон-прычал, што дазваляе ажыццяўляць водныя прагулкі адначасова некальным людзям на інвалідных калясках. Прычым плавальным сродкам яны могуць кіраваць самастойна.

Па маршруце «Падарожжа ў свет прыроды і музыкі» госці адпраўляюцца ў незабыўны тур. Пачынаецца маршрут з сядзібы «Коні-Поні», дзе галоўныя, як можна здагадацца, — коні. Тут кіраваць конным экіпажам могуць і інваліды-калясачнікі. Гаспадар сядзібы Аляксандр Сталерскі распрацаваў спецыяльныя механізм. Па адкідным пандусе каляска заязджае ў брычку, крэсла фіксуецца спецыяльнымі рамянямі — і ўперад. За аснову была ўзята польская павозка, у якую ўстаноўлена трохметровая апарэль, раздзельныя гідраўлічныя тармазы спераду і ззаду, габарытныя агні. Сядзіба «Экафлора» — сапраўднае царства кветак. Тут гасцей чакае мноства цікавых і карысных ведаў пра кветкі, майстар-клас па вырабе кветак з паперы ці тканіны. У сядзібе «Хутар Дудар» гаспадар Алесь Лось адкрые гасцям багацце традыцыйнай беларускай музыкі. Тут можна наведаць музей са старажытнымі народнымі музычнымі інструментамі: дуды, флейты, цымбалы, ліры, гармонікі і акардэоны, даведацца іх гісторыю і атрымаць асалоду ад гучання. На майстар-класах па саломапляценні, выцінанцы, ігры на скрыпцы, іншых інструментах, народных танцах раскрыць свой



творчы патэнцыял могуць у тым ліку і госці з інваліднасцю. Сапраўды ж, творчасць не мае абмежаванняў.

Самы смачны і салодкі адпачынак чакае гасцей на мядовым маршруце. Акрамя ласункаў, тут можна атрымаць веды пра традыцыі бортніцтва на Беларусі ад вытокаў да сучаснасці. У сядзібе «Свет пчол» пчаляры Васіль і Ганна Фраловы, карыстаючыся сямейным вопытам, раскрыюць сакрэты народнага промыслу. Інтэрактыўная экскурсія пазнаёміць з адметнасцямі арганізацыі пчаліных сямей, адкрые дзіўны свет вытворчасці мёду. Зразумела, што паўдзельнічаць у гэтай экскурсіі можа кожны госць, незалежна ад асаблівасцяў здароўя. А на сядзібе «Мядовая каралева» раскажуць, якімі дзіўнымі лекавымі магчымасцямі валодаюць вырабы з мёду.

Шчыра і гасцінна ўмеюць прымаць і на аграэкасядзібах «Ганка» і «Налібоцкія васількі», якія таксама ўдзельнічаюць у праекце «Валожын без бар'ераў». На сядзібах створана якаснае і зручнае безбар'ернае асяроддзе. Тут ведаюць, як знайсці падыход да кожнага госця і зрабіць яго знаходжанне на сядзібе цікавым. І спыняцца на гэтым не плануюць, бо разумеюць: людзям з інваліднасцю трэба адчуваць сябе здольнымі рабіць нешта самім. Так, на сядзібе «Ганка» збіраюцца зрабіць адзіны ў краіне цэнтр хлебнага рамяства. У планах праекта, абавязкова — стварыць усе ўмовы для людзей з інваліднасцю і нават такія, каб госці маглі застацца на ноч. Як вядома, хлеб за некалькі гадзін не робіцца. Але пакуль ажыццявіць планы перашкаджае галоўная турыстычная праблема — пандэмія каранавіруса.

